# ДА ЮБІЛЕЮ ВОБЛАСЦІ

**ВЯРЭЙКІ. 6 верасня ў аграгарадку Вярэйкі (Ваўкавыскі раён) з нагоды святкавання 80-годдзя Гродзенскай вобласці зладзілі тэматычнае мерапрыемства – творчую сустрэчу члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэта-земляка Віктара Курловіча пад назвай «Калыска натхнення – мой Гродзенскі край».**

На літаратурнае мерапрыемства з удзелам беларускага паэта ў Вярэйкаўскі дом культуры былі запрошаны старшакласнікі Вярэйкаўскай сярэдняй школы і іх настаўнікі. Арганізатары сустрэчы пастараліся зрабіць яе запамінальнай і максімальна карыснай. Невыпадкова для адкрытага дыялогу з аўдыторыяй абралі фармат літаратурнай гасцёўні пад назвай «Калыска натхнення – мой Гродзенскі край». Ідэйна-тэматычны змест сустрэчы вызначыў каляндар, а менавіта святочны дзень 6 верасня 2024 года, калі ў Гродзенскай вобласці адзначылі 80-гадовы юбілей яе ўтварэння.



Віктар Георгіевіч патлумачыў зацікаўленай моладзі, чаму роднае Прынёманне ён вобразна называе «калыскай натхнення», пагутарыў на тэмы мастацкгага ўвасаблення вобразу малой радзімы і ролі літаратурнага мастацтва ў справе выхавання асобы. Свае тэзісы літаратар падмацаваў дэкламаваннем уласных паэтычных твораў пераважна патрыятычнага і філасофска-патрыятычнага характару. Дарэчы, патрыятычнай тэматыкай вызначаецца творчасць многіх калег Віктара Курловіча па Гродзенскім абласным аддзяленні СПБ – паэтаў Людмілы Кебіч, Мікалая Іваноўскага, Браніслава Ермашкевіча і іншых.

Юныя грамадзяне Беларусі не толькі ўважліва слухалі выступленне паэта, але і самі актыўна далучаліся да працы юбілейнай літаратурнай гасцёўні. Сустрэча падарыла масу станоўчых эмоцый, пакінула ва ўсіх яе ўдзельнікаў мноства яркіх уражанняў і пацвердзіла ісціну – самае дарагое месца ў сэрцы кожнага чалавека займае яго родны край. З юбілеем, Гродзеншчына! Міру табе і працвітання!

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас творчай сустрэчы члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэта Віктара Курловіча пад назвай «Калыска натхнення – мой Гродзенскі край», прымеркаванай да 80-годдзя ўтварэння Гродзенскай вобласці. Аграгарадок Вярэйкі, Ваўкавыскі раён. 6 верасня 2024 года.






саюз пісьменнікаў Беларусі


Гродзенскай
вобласці
80




саюз пісьменнікаў Беларусі








ГРОДНЕНЩИНА


Гродзенскай
вобласці
80


Гродзенскай
вобласці
80